зультативности формирования информационной компетентности зависит от педагогического потенциала всей среды, а не отдельных ее компонентов, которые являются лишь источниками саморазвития.

1. *Митрахович, В. А.* Потенциал как педагогическая категория / В. А. Митрахович // Известия Волгоградского государственного педагогического университета. – 2008. – № 9. – С. 16–20.

2. *Тимофеева, А. Г.* Основные характеристики средового подхода к начальному экологическому образованию / А. Г. Тимофеева // Известия Саратовского университета. Новая серия. Акмеология образования. Психология развития. – 2010. – Т. 3. – № 1. – С. 74–80.

3. Формирование информационной компетентности в региональной образовательной среде / А. А. Темербекова [и др.]. – Горно-Алтайск : ГАГУ, 2011. – 225 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АДУКАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ ЯК СРОДАК МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ

***В. І. Мазалеўскі,***
*аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Музейная педагогіка вызначаецца як «памежная навуковая дысцыпліна, якая знаходзіцца на стыку музеязнаўства і педагагічных навук, якая даследуе адукацыйныя мэты ў дачыненні да спецыфічных формаў музейнай камунікацыі» [3, с. 26]. Выхаванне з’яўляецца шматаблічным, яго неабходна разглядаць як грамадскую з’яву, дзейнасць, працэс, каштоўнасць, сістэму ўздзеяння і ўзаемадзеяння. У шырокім сэнсе гэта мэтанакіраванае выхаванне, якое ажыццяўляецца сістэмай вучэбна-выхаваўчых установ, у вузкім – гэта выхаваўчая праца, накіраваная на фарміраванне пэўных якасцей, поглядаў, пераканання, г. зн. вырашэнне канкрэтных выхаваўчых задач.

У сучасных умовах галоўнай мэтай выхаваўчага працэсу з’яўляецца маральнае выхаванне падрастаючага пакалення. Вывучэнне сучаснай практыкі музейнай справы сведчыць аб пастаянным узрастанні ролі музеяў у сістэме адукацыі, навукі і культуры, іх уплыве на выхаванне моладзі. У першую чаргу

гэта адносіцца да музеяў гістарычнага профілю, што валодаюць адмысловымі выхаваўчымі магчымасцямі.

Прадметам даследавання музейнай педагогікі з’яўляецца пэўная частка музейнай дзейнасці, яго адукацыйна-выхаваўчы працэс. Музейная педагогіка з’яўляецца ў пэўным сэнсе навукай, што сінтэзуе элементы педагогікі і музеязнаўства. Яна адначасова з’яўляецца часткай музеязнаўства і адносіцца да галін педагагічных навук. Музейная педагогіка – гэта грамадска-навуковая спецыяльная дысцыпліна, якая вывучае змест і прынцыпы, а таксама метады спецыфічнага для музея працэсу выхавання і адукацыі [4].

Музей адлюстроўвае значныя падзеі ў гісторыі Беларусі, гісторыю малой радзімы і жыццё яе вядомых людзей, – гэта не толькі даніна мінуламу, гэта цэнтр культурнага жыцця [2, с. 7].

Навучанне ў школе або вну немагчыма сабе ўявіць без удзелу школьнікаў і студэнтаў у навукова-даследчай працы. Адной з найважнейшых задач, якія стаяць перад сучасным грамадствам, з’яўляецца забеспячэнне высокай якасці навуковых даследаванняў. Пад даследаваннем разумеецца асаблівая форма дзейнасці, звязаная з выпрацоўкай, распаўсюджваннем і прымяненнем ведаў, якімі грамадства раней не валодала. Вывучэнне выяўленых фактаў дазваляе ўсталяваць новыя ўзаемасувязі, якія ўзбагачаюць тэарэтычныя веды аб заканамернасцях развіцця прыроды і грамадства.

Даследаванні з’яўляюцца састаўной часткай навуковай працы музеяў. Іх вынікі папаўняюць скарбніцу навуковых адкрыццяў і выкарыстоўваюцца шматлікімі навуковымі дысцыплінамі. Адначасова яны складаюць аснову музейна-спецыфічных работ, навукова абгрунтаванага і планамернага камплектавання фондаў і апісання музейных прадметаў. Так як музей з’яўляецца поліфункцыянальнай установай, то яго навуковыя даследаванні маюць комплексны і шматбаковы характар.

Узаемадзеянне музея з рознымі адукацыйнымі ўстановамі і грамадскімі арганізацыямі пашырае кантакты навуковых супрацоўнікаў музея. Правядзенне мерапрыемстваў з удзелам моладзі дазваляе прыцягнуць аматараў гісторыі і культуры да навукова-даследчай дзейнасці. Правядзенне на базе музея сустрэч з аўтарамі карцін, літаратурных твораў з наступным абмеркаваннем іх у школьнай, студэнцкай аўдыторыі эфектыўна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапамагае ажыццяўляць асобасна-арыентаванае выхаванне [1, с. 178].

Духоўнае жыццё краіны, горада ці вёскі прадвызначаецца шырокай сукупнасцю аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў – ад развітасці механізмаў сацыяльна-культурнай сферы і ўзроўня грамадзянскіх свабод да ступені актыўнасці грамадскіх аб'яднанняў, культурных рухаў ці рэлігійных канфесій.

Музей прымае на сябе абавязак захавання гістарычнай памяці, прапаганды нацыянальна-культурных традыцый, маральнага, эстэтычнага, гісторыка-патрыятычнага выхавання розных груп насельніцтва і ў першую чаргу дзяцей і моладзі; распрацоўвае механізм рэалізацыі свайго культурнага патэнцыялу.

Асаблівую ролю ў забеспячэнні маральнай пераемнасці пакаленняў адыгрываюць гістарычныя музеі, закліканыя адлюстраваць эпоху, ператварыць дакументы гісторыі і ўзоры культурнай дзейнасці ў сродак інфармацыйна-лагічнага і эмацыянальна-вобразнага ўздзеяння, якія дапамагаюць моладзі спасцігаць вечныя каштоўнасці чалавецтва.

Сістэма адукацыйных арыенціраў у гуманітарнай парадыгме прызнае чалавека найвышэйшай каштоўнасцю. Яго права на самавызначэнне, самарэалізацыю, самаразвіццё садзейнічае працэсу самасцвярджэння асобы, пошукаў сваёй сістэмы светабачання і інш.

Сусветная псіхолага-педагагічная навука развівалася ў рамках прыродазнаўчай парадыгмы, якая характарызуецца ўяўленнямі класічнай філасофіі аб навуцы як універсальным, адзіным веданні з агульнапрызнанымі вобразамі і нормамі, аб'ектыўнай праўдай, крытэрыем якой служыць практыка. Яе каштоўнасцямі з'яўляюцца: захаванне і ўтрыманне культурных традыцый; падрыхтоўка кампетэнтных кадраў, якія забяспечваюць рост прадуктыўнасці працы і дабрабыту грамадства; разумовае развіццё школьнікаў, студэнтаў у працэсе актыўнага і свядомага засваення ведаў асноў навук і іх практычнага прымянення; фарміраванне ўяўленняў аб навуковай карціне свету.

У Рэспубліцы Беларусь педагагічная навука вырашала выхаваўчыя задачы з устаноўкай на перадачу сацыяльнага вопыту, неабходнага для жыцця і працы, трансляцыю культурных каштоўнасцяў ад старэйшага пакалення да малодшага, арганізацыю адукацыйна-выхаваўчых уздзеянняў на людзей з мэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасягнення ўстойлівых сацыяльна значных змяненняў у іх свядомасці і паводзінах.

Масавая выхаваўчая, адукацыйная праца музеяў – састаўны найважнейшы элемент музейнай камунікацыі, накіраваны на фарміраванне гарманічна развітай, грамадска актыўнай асобы, на яе маральнае, эстэтычнае выхаванне, на паглыбленне інфармаванасці і адукаванасці.

Выкарыстоўваючы розныя формы музейнай камунікацыі (экспазіцыі, выставы і др.), музеі аказваюць уздзеянне на розныя сацыяльныя, узроставыя, прафесійныя катэгорыі насельніцтва.

У адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці музея закладзены вялікія магчымасці. Пры дапамозе сваіх матэрыялаў ён здольны эфектыўна ўздзейнічаць на фарміраванне маральных якасцей асобы. Адначасова гэта важны ўклад у выхаванне асобы, здольнай да самавыхавання і самаразвіцця, ва ўзбагачэнне духоўнага жыцця, у рацыянальную арганізацыю вольнага часу і культурнага адпачынку. Пры гэтым асноўная задача музея бачыцца не проста ў папаўненні гістарычнымі ведамі, а каб прывіць навыкі гістарычнага мыслення розным па ўзроўні адукацыі катэгорыям наведвальнікаў, у фарміраванні пачуцця гонару за права жыць у сваёй краіне. Музей з'яўляецца месцам, дзе чалавек не толькі набывае веды, але і ўспрымае назапашаны гістарычны вопыт, засвойвае маральныя каштоўнасці, г. зн. атрымлівае светапоглядны і эмацыйны зарад.

На сучаснага чалавека абвальваецца велізарны струмень рознай інфармацыі, але музеі валодаюць уласцівым толькі ім спецыфічным спосабам перадачы інфармацыі. Наведвальнікі выкарыстоўваюць магчымасць азнаёміцца з дасягненнямі мінулых пакаленняў. У музейных экспазіцыях яны знаёмяцца са сваімі продкамі, а ў сучасных раздзелах выяўляюць сучаснікаў. Музей знаёміць іх з рознымі эпохамі і з рознымі бакамі жыцця народа.

Музеі як асаблівы тып навукова-асветніцкіх устаноў адлюстроўваюць сацыяльны падыход да пазнання і адлюстравання свету, характэрны для свайго часу. Прапагандуючы гістарычна значныя каштоўнасці культуры, выкарыстоўваючы іх эфектыўна, яны рыхтуюць моладзь свабодна арыентавацца ў велізарнай інфармацыйнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, у сучасных умовах музеі перажываюць новы этап свайго развіцця. Яны больш выразна вызначаюць праблемы спецыфікі сваёй працы з адукацыйнымі ўстановамі, звязанымі з развіццём гістарычнай навукі; супрацоўнічаюць з дзяржаўнымі і міжнароднымі арганізацыямі. Значным і актуальным з'яўляецца пашырэнне сувязяў з адукацыйнымі ўстановамі ў плане іх супрацоўніцтва ў асветніцкай і навукова-даследчай працы. Сукупнасць інфармацыі аб розных баках жыцця і дзейнасці асобнай выдатнай асобы можа з'яўляцца асновай зместу адукацыі і выхавання. Выкарыстанне ў выхаванні школьнікаў, студэнтаў гісторыяй роднага краю разнастайных сродкаў, метадаў і формаў забяспечвае фарміраванне гістарычнай свядомасці, маральных якасцяў, патрыятычных пачуццяў і нацыянальнай годнасці.


1. *Ордуханян, Л. И.* Формирование патриотизма у студентов средствами музейной педагогики : дис ….канд. пед. наук : 13.00.01 / Л. И. Ордуханян. – Владикавказ, 2004. – 190 с.

2. *Тверская, Д. И.* Музей как научно-исследовательское учреждение / Д. И. Тверская // Музейное дело в СССР. – С. 5–17.

3. *Юхневич, М. Ю.* Музейная педагогика – профессия! / М. Ю. Юхневич // Советский музей. – 1991. – № 1, 13. – С. 26–29.

4. *Schreiner, K.* Museologiessche Termini / K. Schreiner. – Auswahl, 1982. – P. 4.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ОБРАЗОВАНИЕ В СФЕРЕ КУЛЬТУРЫ: СУЩНОСТНО-СОДЕРЖАТЕЛЬНЫЕ ДЕТЕРМИНАНТЫ


***И. А. Малахова,***

*доктор педагогических наук, доцент,*
*заведующий кафедрой психологии и педагогики*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*


Образование в сфере культуры представляет собой подготовку, переподготовку и повышение квалификации специалистов в области культурно-досуговой деятельности, библиотечного дела, а также педагогов, руководителей творческих коллективов, артистов всех видов искусства.

Национальная система образования в сфере культуры включает две подсистемы – основное и дополнительное образова-